ранавічы, 116 км ад Мінска, каля аўтадарогі Слуцк—Брэст. Цэнтр Знаменскага с/с. 201 гаспадарка, 496 жыхароў (2012).

У 1800 вёска ў Слуцкім павеце Мінскай губ., 65 двароў, 598 ж., уласнасць Д.Радзівіла. У 1844 вёска, заезны двор, маёнтак, уласнасць кн. Л.Вітгенштэйна. У 1897 — 129 двароў, 782 ж., капліца, 2 школы, магазін, піцейны дом. У 1911 адкрыта земская школа. У 1917 — 149 двароў, 870 ж. З 1919 у БССР. У 1920 адкрыта 4-гадовая школа. З 17.7.1924 у Слуцкім р-не Слуцкай акругі. З 20.8.1924 у Сераднякоўскім с/с. У 1926 — 151 двор, 748 ж. З 9.6.1927 да 26.7.1930 у Бабруйскай, з 21.6.1935 зноў у Слуцкай акругах. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. З 1939 цэнтр Сераднякоўскага (з 1.10.1973 Знаменскага) с/с. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да 30.6.1944 З. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 да 8.1.1954 у Бабруйскай вобл. У 1959 — 830 ж. У 1986 — 238 гаспадарак, 590 ж.

У 2012 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**ЗНАМЯНАЛЬНЫЯ СЛО́ВЫ**, паўназначныя часціны мовы, якія валодаюць самаст. лексічным значэннем і з'яўляюцца пэўнымі чл. сказа («вёска», «сіні», «яна», «той», «сем», «думаць», «лёгка», «тут»). З.с. ўтвараюць гал. лексічны і граматычны фонд мовы і групуюцца ў наступныя класы: назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, дзеясловы, прыслоўі. Усе З.с. (за выключэннем нязменных прыслоўяў) характарызуюцца комплексам выражаных граматычных значэнняў і маюць наступныя асаблівасці: выконваюць намінатыўную функцыю (за выключэннем займеннікаў, якія выконваюць дэйктычную функцыю, г.зн. паказваюць на прадметы і іх прыкметы): называюць прадметы, прыкметы, працэсы і інш. з'явы навакольнага свету; маюць фанетычны націск: лагічны націск у сказе прыпадае на адно са знамянальных слоў; валодаюць марфемнай структурай; маюць граматычныя катэгорыі; функцыянуюць у складзе сказа ў якасці яго чл. Ва ўсх.-слав. граматыцы падзел слоў на знамянальныя і незнамянальныя часціны мовы аформіўся ў 18 ст.

*Літ.*: Беларуская граматыка. Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. Мінск, 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Плунгян В.А. Общая морфология: Введение в проблематику. М., 2003.

*Д.В.Дзятко.*

**ЗНАХАР**, знахарка, паводле даўніх народных уяўленняў, чалавек, надзелены звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі, які нібыта можа дапамагаць ці шкодзіць людзям, уздзейнічаць на прыродныя з'явы, лячыць хваробы. Ужо першыя пісьмовыя дакументы засведчылі мноства назваў заклінальнікаў-З.: шаптун (шаптуха), чараўнік (чараўніца), вядзьмар, лекаркі. З. з'яўляюцца выканаўцамі замоўных рытуалаў. Вялікае значэнне надаецца месцу і часу правядзення магічных дзеянняў. Статус З. звычайна вызначаўся накіраванасцю яго дзейнасці: лічылася, што З.-лекары, дабрадзейныя З. карысталіся «белай», а ведзьмары і чараўнікі, якія прымянялі свае сілы і здольнасці як інструмент зла, — «чорнай» магіяй. У залежнасці ад крыніцы і спосабу атрымання магічнай сілы ў народзе вылучаюць 2 асн. тыпы З. Е. Раманаў вызначаў іх як «ведзьмакоў навучоных» і «ведзьмакоў прыродных». «Навучоных» (сярод іх пераважалі жанчыны) налічвалася мноства, іх рэпертуар быў даволі абмежаваны і вядомы пераважна ў сваёй мясцовасці. Практычна неабходныя быт. замовы перадаваліся з роду ў род. Акрамя таямнічых слоў і магічных дзеянняў, шаптухі ўжывалі і рацыянальныя спосабы і сродкі ўздзеяння на арганізм чалавека, у т.л. травы, тлушчы і інш. «Прыродныя ведзьмакі» (да іх найчасцей належалі тыя, хто быў звязаны з прыродай — леснікі, мельнікі, пастухі і інш.) валодалі спец. ведамі чарадзейства, надзяляліся, як правіла, страшнай патаемнай сілай і маглі шкодзіць і ратаваць ад шкоды. Да іх адносіліся пачціва, але баяліся і не любілі. Магічныя дзеянні лічыліся асабліва небяспечнымі ў пераломныя перыяды (на Каляды, Купалле, у першы выган жывёлы). Паводле павер'яў, перадача ведаў З. (для гэтага выбіраюцца першыя ці апошнія дзеці ў сям'і) адбываецца перад яго смерцю або калі той перастае лячыць.

*Літ.*: Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 5. Витебск, 1891; Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этногр. очерк. Гродно, 1895; Барташэвіч Г.А. Магічнае слова: вопыт. даслед. светапогляднай мастацкай асновы замоў. Мінск, 1990.

*Г.А.Барташэвіч.*

**ЗНАЧЭ́ННЕ СЛО́ВА**, змест лексічнай адзінкі, які ўтвараецца ў выніку адлюстравання пазамоўнай рэчаіснасці ў свядомасці людзей. Перадае разнастайнасць свету, якая выяўляецца ў выглядзе сувязі гучання слова (формы) і яго сэнсавай суаднесенасці (зместу). Самаст. (паўназначнае) слова заўсёды мае рэальны змест, або лексічнае значэнне. Так, лексічнае З.с. слова *радзіма* можна вызначыць як 'краіна, якая гістарычна належыць пэўнаму народу і якую гэты народ насяляе; бацькаўшчына'. У словах службовых часцін мовы З.с. рэалізуецца пры ўжыванні з самаст. словам. Па граматычных законах мовы кожнае самаст. слова можа звязвацца з інш. словамі — у гэтым выпадку яно мае не толькі лексічнае, але і граматычнае значэнне.

У залежнасці ад спосабу намінацыі лексічнае З.с. бываюць прамымі і пераноснымі. Прамое З.с. непасрэдна адлюстроўвае рэчаіснасць: *ельнік* 'яловы лес', *засцерагальны* 'які служыць для засцярогі ад чаго-небудзь', *кідаць* 'штуршком прымушаць ляцець, падаць тое, што знаходзіцца ў руцэ (у руках)'; пераноснае — ад-